О. Д. Липинская

# ГІСТОРЫЯ ПЧАЛЫ Ў ГІСТОРЫІ МАЁЙ КРАІНЫ

*Школьныя падручнікі па гісторыі вельмі скупа і неапраўдана мала даюць звестак аб бортніцтве. У гэтым я бачу праблему і асноўны матыў выбару тэмы даследавання.*

Аб'ктам даследавання былі адабраныя і прааналізаваныя тэксты вучэбнай літаратуры па гісторыі, даведачнай літаратуры, было выдзелена 40 дакументаў, якія адносяцца да розных перыядаў айчыннай гісторыі, адабраны неабходныя ілюстрацыі да тэксту.

Прадметам даследавання з'яўляліся гістарычныя аспекты пчалярства і бортніцтва. Метады даследавання: збор патрэбнай інфармацыі шляхам падбору неабходных гістарычных дакументаў, аналітычны, апісальны, параўнальны метады. Гіпотэза: калі мёд і воск доўгі час (некалькі стагоддзяў) быў стабільным экспартным таварам, то гэта стала магчымым толькі дзякуючы бортніцтву, як форме культурнага пчалярства, а не простаму збору мёду дзікіх пчол.

Мэтай даследавання з'яўляецца спроба паказаць, што бортніцтва было даволі развітай формай пчалярства, самастойнай галіной гаспадарання, з экспартна-арыентаванай прадукцыяй, з дасканалым прававым забеспячэннем. Задачы даследавання: выявіць, што пчалярства было адным са старажытнейшых заняткаў чалавека; вызначыць асаблівасці пераходу да новага этапу бортніцтва як культурнага пчалярства; раскрыць на аснове этнаграфічных матэрыялаў тэхніку і тэхналогію бортніцтва і ўзровень яе развіцця на беларускіх землях; устанавіць ступень нарматыўна-прававога рэгулявання пчалярства ў XVI-XVII стагоддзях. Тэма гістарычнага агляду пчалярства, бортніцтва ў Беларусі распрацавана недастаткова. Найбольш цікавыя і карысныя звесткі па тэме даследавання знойдзены ў зборніках гістарычных дакументаў.

Такім чынам, найбольш поўным і адпаведным азначэннем бортніцтва будзе наступнае: "Бортніцтва – гэта першая форма культурнага пчалярства, пры якім пчол гадавалі, развадзілі і трымалі ў штучных дуплах".Пчала пакінула значны след у гісторыі маёй краіны, след, які вельмі цяжка пераацаніць: у старажытных летапісах, у старажытных прававых дакументах, у міфалогіі, геральдыцы, тапаніміцы, у прозвішчах людзей, у звычаях і традыцыях людзей, у занятках людзей. Пчалярства – адно са старажытнейшых заняткаў чалавека. У эпасе ўсіх вядомых народаў старажытнасці сустракаюцца звесткі аб пчолах і атрымліваемых ад іх прадуктаў – мёдзе і воску. Гісторыя пчалярства такая ж сталая, як і гісторыя чалавецтва. Бортніцтва не правільна ўяўляць як прымітыўнае збіральніцтва мёду дзікіх пчол без якіх–нібудзь прыстасаванняў і прыладаў. Тэхнічна і тэхналагічна бортніцтва было складаней, чым паляванне. Апякунства бортніцтва нормамі права на працягу некалькіх стагоддзяў сведчыць аб вялікім значэнні гэтага віду гаспадарчай дзейнасці. Такім чынам, мёд і воск доўгі час быў стабільным экспартным таварам, гэта стала магчымым дзякуючы бортніцтву, як форме культурнага пчалярства, а не простаму збору мёду дзікіх пчол.

### *Список литературы*


1. Белоруссия в эпоху феодализма. Т.1, с древнейших времен до середины XVII века, – Мінск: Академия наук БССР, 1959.
2. Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 3, 1772 – 1860. – Мінск: Академия наук БССР, 1961.
3. Хрестоматия по истории Беларуси в двух частях. – Мінск: Издательский центр БГУ, 2008. – Ч. 1. С древнейших времен до 1917 года.
4. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мінск: БелСЭ імя П. Броўкі, 1989.
5. Бабіч А. Ю. Пчалярства як культурная форма лесакарыстання беларусаў у XX – пачатку XXI стагоддзя. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/pchalyarstva-yak-kulturnaya-forma-lesakarystannya-belarusa-u-xx-pachatku-xxi-st.


*Липинская Ольга Дмитриевна*, студентка 1 курса экономического факультета БГУИР.
*Научный руководитель: Куракевич Наталья Ивановна*, доцент кафедры гуманитарных дисциплин БГУИР, кандидат исторических наук, kurakevich@bsuir.by.